УДК 821.113Дзікенс

**Я. В. Гамеза**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

## КАНЦЭПЦЫЯ ДЗЯЦІНСТВА Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ЧАРЛЬЗА ДЗІКЕНСА: АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ І ВОБРАЗЫ

**Уводзіны.** Адной з «вечных» тэм сусветнай літаратуры з'яўляецца тэма дзяцінства, якая ў розныя перыяды гістарычнага развіцця атрымлівала новую інтэрпрэтацыю, але заўсёды заставалася актуальнай. З'яўленнем пільнай увагі да жыцця і праблемах дзіцяці мы абавязаны эпосе Асветніцтва, калі для дзіцяці як галоўнага аб'екта выхавання пачынае ствараецца дзіцячая літаратура, накіраваная наператварэнне яго з «пустога месца» (паводле думкі Дж. Лока) у сталага чалавека, надзеленага маральнымі дабрачыннасцямі. Як адзначае А. В. Бабук, «асэнсаванне дзяцінства і афармленне яго ў культурны міф у творчасці рамантыкаў мела вялікае значэнне для літаратуры XIX стагоддзя. Міф дзяцінства вызначае ў літаратуры рэалізму і ў творчасці канкрэтных пісьменнікаў парадыгму ўспрымання і асэнсавання рэчаіснасці. У той жа час індывідуальна-творчая распрацоўка тэмы дзяцінства ў адпаведнасці з новай эстэтыкай ускладняе ўяўленне пра дзяцінства, што прыводзіць да ўдакладнення структуры і ўзбагачэння матыўна-вобразнай сістэмы феномена дзяцінства» [1, с. 64].

**Асноўная частка.** Ч. Дзікенс прыцягвае чытачоў усіх краін вось ужо больш за паўтара стагоддзя менавіта сваім уменнем «закрануць агульначалавечыя струны». Пісьменнік стварае вобразы добрых, прыстойных, надзеленых справядлівымі каштоўнасцямі людзей. Сакрэт яго папулярнасці ў тым, што Ч. Дзікенс востра адчуваў змены ў жыцці Англіі, быў выразнікам надзей і памкненняў некалькі тысяч чалавек.

Пасля смерці пісьменніка яго творы падлягаюць вострай крытыцы, і толькі ў XX стагоддзе значэнне творчасці Дзікенса робіцца цалкам відавочным. Біяграфія творцы знайшла адлюстраванне і ў сюжэтах яго раманаў, і ў творчай манеры. Бацька Чарльза быў бедны служачы і за даўгі трапіў у турму. Хлопец з ранняга дзяцінства самастойна зарабляў грошы: у розны час працаваў на фабрыцы, клеркам, рэпарцёрам у судзе і парламенце. Як рэпарцёр, ён адлюстроўвае сучасныя яму падзеі і спрабуе зразумець іх прычыны. Вядучую тэму творчасці пісьменніка можна вызначыць як тэму барацьбы дабра і зла. Яна раскрываецца ў кожным яго творы. Ч. Дзікенс лічыў, што менавіта стаўленне грамадства да дзіцяці адлюстроўвае барацьбу дабра і зла ў самім дзіцяці. Таму тэма дзяцінства — адна з галоўных тэм у яго творчасці.

Першачарговымі задачамі выхаваўчага працэсу ў школе і сям'і Ч. Дзікенс лічыць прывіццё сапраўдных маральных каштоўнасцей, а таксама, у супрацьвагу традыцыйнаму англійскаму выхаванню XIX стагоддзя, «выхаванне сапраўднага чалавека, а не джэнтльмена». Любоў да Бога, духоўнасць і гуманізм — асноўныя крытэрыі выхаванага чалавека. Ч. Дзікенс адхіляў «дактрыну дзіцячай грахоўнасці», якая існавала ў віктарыянскай Англіі і абвяшчала, што дзіця ад нараджэння грэшнае, а з чатырнаццацігадовага ўзросту нясе поўную адказнасць перад Богам за свядома і неўсвядомлена здзейсненыя грахі. Рэлігійная па сваёй сутнасці дактрына вызначала негатыўны погляд на дзіцячыя гульні, свавольствы, гарэзаванне, якія нязменна разглядаліся як праявы «грахоўнай і д'ябальскай сутнасці дзяцей» [2, с. 51].

Цэнтральным пунктам выхавання Ч. Дзікенс лічыў залежнасць маральнага аблічча падрастаючага пакалення ад асаблівасцей асяроддзя; таксама ён адзначаў асаблівую важнасць сямейнага выхавання, значэнне маральнай атмасферы ў сям'і, яе першапачатковы ўплыў на характар дзіцяці. Гэта знайшло адлюстраванне як у эпісталярыі пісьменніка, так і ў сюжэтах яго твораў. Дзіця займае ці не цэнтральнае месца ў карціне свету Ч. Дзікенса, акцэнтуючы не толькі сацыяльныя, але і маральныя праблемы чалавека XIX стагоддзя. Выкарыстанне такіх катэгорый, як «дзяцінства», «дзіцячы», «дзіця» з'яўляецца адной з дамінант у яго творах. Неабыякавы да лёсу дзяцей у Англіі, пісьменнік займаў актыўную пазіцыю, патрабаваў змяніць стаўленне грамадства да дзіцяці. Творы Ч. Дзікенса, як і ў рамантыкаў, заснаваныя на супрацьпастаўленні свету дзіцяці і рэальнасці навакольнага свету. Пісьменнік паступова пераносіць акцэнт з перыферыі на ядро дзіцячай карціны свету, пра што сведчаць яго раманы «Прыгоды Олівера Твіста», «Крама старажытнасцяў», «Жыццё і прыгоды Нікаласа Нікльбі», «Марцін Чэзлвіт», «Халодны дом», «Вялікія надзеі».

© Гамеза Я. В., 2020



Рэпазіторый БарДУ

Ужо ў першых творах пісьменніка «Нарысы Боза», «Пасмяротныя запіскі Піквікскага клуба», якія з’явіліся ў 1836 годзе, аўтар дакладна малюе жыццё самых бедных слаёў насельніцтва. Сам Ч. Дзікенс на працягу ўсяго жыцця выбіраўся з галечы, таму ненавідзеў беднасць, актыўна крытыкаваў яе і спачуваў бедным людзям, якія праз сваё сацыяльнае становішча не маглі, згодна з віктарыянскім законам, нават уступаць у шлюб. Пісьменнік-гуманіст лічыў, што беднасць з’яўляецца адным з самых страшных выпрабаванняў для чалавека. Акрамя матыву беднасці, у творах Ч. Дзікенса прысутнічае матыў пакінутасці, а дзіця часта прадстаўлены ў іпастасі сіраты. Сіроцтва героя прымушае чытача заглыбіцца ў свет дзіцячых пакутаў. З моманту з’яўлення на свет дзіця ў творах Ч. Дзікенса асуджана на пакуты. Так адбываецца, да прыкладу, у рамане «Прыгоды Олівера Твіста», дзе матыў асуджанасці ўзнікае ўжо ў пачатку твора: «Олівер гучна крычаў. Калі б мог ён ведаць, што ён сірата, пакінуты на міласэрную апеку царкоўных старастаў і наглядчыкаў, магчыма, ён крычаў бы яшчэ гучней» [2, с. 12]. Ч. Дзікенс паказвае Олівера ідэальным, яго характар статычны: герой не падпадае пад уплыў абставін нават калі знаходзіцца сярод ашуканцаў. Дадзены раман цалкам можна разглядаць як біяграфічны. Малюючы развіццё героя, аўтар адлюстроўвае шляхі, якімі ішоў сам. Тут мяжа паміж злом і дабром не вельмі выразная, герояў цяжка падзяліць на абсалютна станоўчых і абсалютна адмоўных: для аўтара важна, у першую чаргу, як духоўна ўзбагачаецца герой. У рамане «Крама старажытнасцяў» на пакуту асуджана маленькая Нэлі, якая, ратуючы свайго дзеда ад ашуканскіх выхадак Квілпа, у складаных жыццёвых абставінах праяўляе ўнутраную сілу. Жадаючы зберагчы дзеда ад жарсці да гульняў у карты, крадзяжу, а таксама ад праследаў карліка Квілпа, маленькая Нэлі ўцякае з ім. Дзяўчынка ў рамане «Крама старажытнасцяў» увасабляе не бесклапотнае дзіця, а тыповага для Ч. Дзікенса героя, у якога з ранняга дзяцінства развіты пачуццё адказнасці за блізкіх і непераадольная цяга да дабрачыннасці.

Маленькія героі Ч. Дзікенса — гэта не звычайныя дзеці, выхаваныя ў звыклых умовах бацькоўскага клопату і ласкі, а ахвяры несправядлівасці жыцця, небяспекі жыццёвых паваротаў. Прычым гэта могуць быць як дзеці з нізоў, так і дзеці з, здавалася б, цалкам шчаслівых сем’яў, лёс якіх, аднак, складваецца не менш драматычна і трагічна. Бесклапотнае дзяцінства Дэвіда Каперфільда абрываецца, калі ў доме з’яўляецца айчым. Тут Ч. Дзікенс паказвае ўсю вастрыню і цяжар неразумення, якое звальваецца на жорстка пакаранага Дэвіда. Герой самотна сядзіць у пакоі і спрабуе хоць неяк усвядоміць, чаму перакуліўся свет, які быў такім ўстойлівым і блаславёным. Амаль усе раманы Ч. Дзікенса маюць шчаслівы фінал, за што аўтара нямала папракалі і пры жыцці, і, асабліва, пасля смерці. Але гэта адна з рысаў філасофіі пісьменніка. Ён лічыў, што літаратура мае моцнае выхаваўчае значэнне, уплывае на свядомасць, а шчаслівы фінал сцвярджае аптымізм, радасць жыцця, гармонію, дае надзею, што чалавек ніколі не будзе самотны. Між тым, пісьменнік-рэаліст Ч. Дзікенс бачыў, што ў жыцці так бывае не заўсёды, таму ён змяняе сваё стаўленне і да праблемы матэрыяльнай узнагароды героя, паказваючы, што дасягненне пэўнага матэрыяльнага ўзроўню не забяспечвае чалавеку шчасця.

**Заключэнне.** Тэма дзяцінства ў творчасці Ч. Дзікенса раскрывае гуманістычны кірунак таленту пісьменніка, сцвярджае дабро і справядлівасць, асуджае абыякавасць грамадства ў дачыненні да дзяцей. Падводзячы вынікі, можна сказаць, што шчырасць, здольнасць верыць і спачуваць — самыя істотныя рысы дзяцінства, якім яно бачыцца Ч. Дзікенсу. Але гэта і складнікі дасканалай, евангельскай асобы, таму ёсць усе падставы сцвярджаць, што Ч. Дзікенс не проста вялікі пісьменнік — ён вялікі хрысціянскі пісьменнік.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Бабук, А. В.* Художественная антропология детства в литературе XIX в. / А. В. Бабук. — Минск : БГУ, 2018. — 143 с.
2. *Диккенс, Ч.* Приключения Оливера Твиста : роман / Ч. Диккенс ; пер. с англ. А. В. Кривцовой. — М. : АСТ : АСТ МОСКВА : Транзиткнига, 2006. — 477 с.



УДК 811.161.1



**И. А. Голуб, Л. В. Прокофьева**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь*


## ЭФФЕКТИВНЫЕ СРЕДСТВА ФОРМИРОВАНИЯ СОЦИОКУЛЬТУРНОЙ КОМПЕТЕНЦИИ

**Введение.** Изменения в социальной, политической и экономической жизни и значительное расширение круга социальных групп людей, вовлеченных в межкультурные контакты в различных сферах человеческой деятельности [3, с. 42—47] обусловили появление социокультурного подхода к обучению языкам международного общения. В связи с чем в последние десятилетия исследователи все больше сосредоточивают внимание на различных аспектах формирования социокультурной компетенции обучающихся (П. В. Сысоев, Н. Г. Соколова, В. В. Сафонова, Е. Д. Кошеляева и др.).


© Голуб И. А., Прокофьева Л. В., 2020



Репозиторий БарГУ